Падтрымай "Вясну" на PATREON

За абразу намесніка міністра ўнутраных спраў - паўтары гады "хатняй хіміі" і тысяча рублёў кампенсацыі

08.07.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед



Алена Новікава ў судзе.

У судзе Мінскага раёна 8 ліпеня вынесены прысуд па крымінальнай справе ў дачыненні да жыхаркі Ждановічаў Алены Новікавай. Яе вінавацяць ў абразе прадстаўніка ўлады па артыкуле 369 КК.

Справу разглядае суддзя **Анжаліка Казлова**, дзяржабвінаваўца - памочнік пракурора **Крысціна Касінская.**

Па матэрыялах следства, 5 сакавіка Новікава з выкарыстаннем інтэрнэту ў ТГ-канале “Тыповая Беларусь” пакінула зняважлівы каментар пад матэрыялам пра намесніка міністра ўнутраных спраў **Генадзя Казакевіча.**

Новікаву затрымалі 27 красавіка, а 30 красавіка адпусцілі пад падпіску аб нявыездзе. Сваю віну прызнае цалкам. Кажа, што слова “сука” тычылася не канкрэтна Казакевіча, а артыкула ўвогуле.

7 ліпеня пацярпелы ў суд не з’явіўся, просіць суд разгледзець справу ў яго адсутнасць. Таксама заяўляе матэрыяльную прэтэнзію у якасці кампенсацыі маральнай шкоды ў памеры 1 000 рублёў.

> *“Новікава спрабавала сваім каментаром перашкодзіць мне выконваць свае абавязкі”,* - напісаў Казакевіч у заяве.

Абвінавачаная прыйшла на працэс без адваката. Суддзя запыталася - чаму без адваката, па матэрыяльных прычынах? Новікава адказала, што так, па матэрыяльных.



Суддзя Анжаліка Казлова

У ТГ-канале быў змешчаны артыкул аб мітынгах, дзе Казакевіч назваў пратэстуючых наркаманамі, алкаголікамі, дармаедамі.

Суддзя пытаецца, адкуль Новікава ведае, хто ходзіць на мітынгі, самі хадзілі?

Новікава:

> *- Толькі 16 жніўня, але ёсць знаёмыя, якія наведваюць. Столькі няма ў нас наркаманаў-дармаедаў.*

- Якія мэты пераследавалі? – пытаецца суддзя.

> *- Ніякіх, напісала і напісала.*

Між тым, у справе ёсць паказанні, што Новікава апублікавала гэты каментар з помсты Казакевічу за ягоныя дзеянні.

> *- Тады я не разумела, што гэтым словам абражаю. Проста тады не спадабаўся артыкул,* - тлумачыць яна.

У судзе дапытваюць сведку **Яўгена Калінку,** супрацоўніка Галоўнага ўпраўлення ўласнай бяспекі МУС:

> *- Калі 16 красавіка мы прыйшлі з ператрусам у кватэру да Новікавай, яна сама выдала тэлефон, разам агледзелі ТГ, знайшлі каментар. Не адмаўляла, што гэта зрабіла яна на эмоцыях, прачытала артыкул і каментары, слова адрасавалася Казакевічу. Размяшчала каментар пад сваім імем Алена Новікава.*

У справе - вынікі экспертызы, у якой зроблены агляд ўсіх каментароў да гэтага артыкула. У каментары Новікавай дадзеная негатыўная ацэнка Казакевіча, у тым ліку, слова "сука".


Сёння суддзя вынес прысуд: **адзін год і шэсць месяцаў абмежавання волі без накіравання ва ўстанову адкрытага тыпу.** Абавязковае працаўладкаванне.


Задаволены матэрыяльны пазоў у памеры 1 000 рублёў.


Тэлефон канфіскаваць як сродак здзяйснення злачынства.

Твитнуть




Вясна. Правы чалавека ў …
9 922 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами



СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску
"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ
Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы
Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА
"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі" – акцыя вясноўцаў у Вільні

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

"Суды згубілі сваю функцыю, а грамадзянская супольнасць перанесла знішчальную атаку". Павел Сапелка — на канферэнцыі АБСЕ

Праваабарончая праграма "Вясна" на Беларускім Радыё Рацыя

Грамадзяніна Польшчы асудзілі ў Беларусі за "агентурную дзейнасць"

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць







ПАРТНЁРСТВА

Рацыя

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

Вытокі

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

СЯБРОЎСТВА

EENEMO
European Network of Election Monitoring Organizations

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

VOICE OF BELARUS

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

